1. *Аппиньянези, Л.* Кабаре / Л. Аппиньянези ; пер. с англ. Н. Калошиной, Е. Канищевой. – М. : Новое литературное обозрение, 2010. – 288 с. : ил. (Серия «Культура повседневности»).

2. *Тихвинская, Л. И.* Повседневная жизнь театральной богемы серебряного века : кабаре и театры миниатюр в России. 1908–1917 / Л. И. Тихвинская. – М. : Молодая гвардия, 2005. – 527 [1] с. : ил. (Серия «Живая история: Повседневная жизнь человечества»).

3. Музычны тэатр Беларусі : 1917–1959 / Г. Р. Куляшова [і інш.] ; падрэд. Т. Г. Мдывані. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 432 с. : іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Л. К. Валасюк,***
*дац. каф. народна-інструментальнай творчасці БДУКМ*

# АНСАМБЛЕВАЕ ВЫКАНАЛЬНІЦТВА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

У развіцці музычнай культуры Беларусі важнае месца займаюць розныя формы калектыўнага інструментальнага выканальніцтва. У цяперашні час беларускя музычная выканальніцкая школа стала адметнай часткай агульна-еўрапейскай мастацкай культуры, даказала неабходнасць засваення і працяггвання нацыянальных традыцый. Гэты працэс заснаваны на агульна-эстэтычных прынцыпах акадэмічнага музычнага выканальніцтва ў яго разнастайных формах і жанрах, функцыяніруючых у цеснай сувязі з прафесійным і традыцыйна-фальклорным пачаткамі.

Ансамблевае выканальніцтва на народных інструментах з'яўляецца адной з форм калектыўнага музіцыравання і на сучасным этапе вельмі распаўсюджана. Гэта папулярная і даступная форма прафесійнага і аматарскага музіцыравання. Яна адыгрывае важную ролю ў прапагандзе народных інструментаў, народнай і класічнай музыкі, у музычна-эстэтычным выхаванні народа. Ансамблевае выканальніцтва на народных інструментах развіваецца па трох напрамках: прафесійнае, вучэбнае, аматарскае. Прафесійныя калектывы народна-інструментальнага мастацтва традыцыйна ўзаемадзейнічаюць з самадзейнымі і вучэбнымі ансамблямі і аркестрамі, якія імкнуцца дасягнуць іх прафесійнага майстэрства, як у плане выканаль-

ніцкім, так і ў плане авалодання іх рэпертуарам. У прафесійных калектывах ён пастаянна абнаўляецца. Прыкладам эфектыўных выканальніцкіх кантактаў можа быць узаемадзеянне Нацыянальнага акадэмічнага аркестра народных інструментаў імя І. І. Жыновіча; Дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі «Свята»; народнага ансамбля «Бяседа»; Дзяржаўнага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі» і інш. з самадзейнымі і вучэбнымі інструментальнымі ансамблямі. У рэспубліцы створана шырокая сетка музычных і культурна-асветных устаноў. Ва ўсіх навучальных установах, пачынаючы з ДМШ і да вышэйшых устаноў, існуюць вучэбныя ансамблі. У вучэбных ансамблях у працэсе навучання найбольш выкарыстоўваюцца дуэты, трыа, як аднародныя, так і змешаныя па саставу. Гэта прызнаныя, вызначаныя формы, якія маюць свае выканаўчыя традыцыі, заснаваныя на народна-інструментальнай творчасці. Акрамя традыцыйных саставаў – дуэтаў і трыа – ужываюцца квартэты, квінтэты, секстэты, актэты і змешаныя ансамблі. Узровень музычнай падрыхтоўкі выканаўцаў даволі высокі, яны добра валодаюць сваім асноўным інструментам, музыканты асвойваюць і іншыя інструменты, іграюць на некалькіх. Так, ва ўніверсітэце культуры і мастацтваў на кафедры народна-інструментальнай творчасці з 1991 г. адкрыта спецыяльнасць «кіраўнік ансамбля», якая больш за дваццаць гадоў рыхтуе студэнтаў для практычнай дзейнасці ў якасці кіраўнікоў рознага тыпу ансамблей. На кафедры існуюць ансамблі розных складоў і напрамкаў, дзе студэнты ўдасканальваюць навыкі ансамблевага выканання, авалодваюць навыкамі ігры на некалькіх музычных інструментах, што дае магчымасць пашырыць репертуар, а таксама, шматкаляровыя фарбы гучання. Падбор рэпертуару з’яўляецца адным з вырашальных фактараў у стымуляванні мастацкага і тэхнічнага росту ансамблевых выканаўцаў. Неабходна выкарыстоўваць усё багацце кампазітарскіх стыляў і жанраў, уключаць у рэпертуар творы замежнай, рускай, беларускай класікі, а таксама лепшыя ўзоры народнай музыкі.

Напрыканцы XX ст. на Беларусі адбываецца значны рост аматарскіх калектываў народнай музыкі. Іх колькасць узрасла ў некалькі разоў у параўнанні з папярэднімі гадамі. У гэты час былі створаны многія аматарскія народныя ансамблі, якія карыстаюцца папулярнасцю і да цяперашнега часу. У іх ліку «Крупіцкія музыкі», «Капыльскія дудары», «Лявоны», «Лідскі

РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ

гармонік», «Рагнеда», «Вязынка», «Церніца» і інш. Названыя народна-інструментальныя ансамблі пры разнастайнасці іх творчага аблічча, імкнуцца захаваць і развіць народныя традыцыі, што з'яўляецца надзённай задачай у наш час. Для гэтага важна выпрацаваць новыя арганічныя формы іх існавання, стварыць сінтэтычныя формы, спалучаючы гістарычную спадчыну і сучасныя мастацкія пошукі ў вобласці аматарскай творчасці. Міністэрства культуры рэспублікі штогод плануе правядзенне шэрагу фальклорных і этнаграфічных фестываляў, агляд самадзейнай творчасці.

У цяперашні час у мастацкай самадзейнасці больш распаўсюджваецца ансамблевае выканальніцтва на народных інструментах, якія адрозніваюцца як па саставе, рэпертуары, так і па манеры выканання. Гэта выклікана перш за ўсё тым, што ансамбль больш мабільны, чым аркестр, больш гібкі ў засваенні праграмы, не выклікае вялікіх цяжкасцей у кіраўніка з арганізацыяй.

У практычнай рабоце кіраўнікі самадзейных аркестраў, вельмі часта звяртаюцца да разнастайных форм ансамбляў малых складоў.

За апошнія дзесяцігоддзі склад удзельнікаў самадзейных калектываў моцна змяніўся, кантынгент яго стаў больш музычна адукаваны. У многіх самадзейных калектывах іграюць музыканты з сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыяй. Ва ўсіх абласцях рэспублікі існуюць шмат ансамблевых калектываў розных жанраў, напрамкаў, многія маюць ганаровае званне «народны», «узорны».

Развіццё ансамблей народных інструментаў ідзе ў дзвух асноўных напрамках: фальклорным і акадэмічным.

Ансамблі фальклорнага напрамку вывучаюць творчасць народа, традыцыйныя формы і жанры нацыянальнай музычнай культуры.

Ансамблі рэканструяваных (удасканаленых) народных інструментаў, асноўны напрамак іх дзейнасці – прапаганда твораў, што пішуцца кампазітарамі спецыяльна для падобнага роду ансамбляў на аснове народнай музыкі, перакладанне твораў кампазітараў розных эпох і нацыянальнасцей.

На Беларусі распаўсюджаны больш ансамблі змешанага складу, якія ўключаюць як агульна-распаўсюджаныя інструменты, так і нацыянальна-этнаграфічныя. Апошнім часам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

назіраецца тэндэнцыя да ўсё больш разнастайнага выкарыстання народных музычных інструментаў калектывамі самых розных творчых напрамкаў. Кіраўнікі ансамблей самі робяць шмат аранжыровак народных мелодый, перакладаў розных твораў, апрацоўваюць мясцовы фальклор, маюць цесныя сувязі з беларускімі кампазітарамі. Для многіх калектываў сёння характэрна спалучэнне інструментальнай музыкі са спевамі, танцам, сцэнічным рухам, гэта значыць сінтэз шматжанравага мастацтва. Гэта характэрна і для прафесійных калектываў, такіх, як ансамблі народнай музыкі «Бяседа» (кіраўнік Л. Захлеўны); «Свята» (кіраўнік У. Кашталапаў); прафесійны калектыў другога напрамку – фальклорна-харэаграфічны ансамбль «Харошкі» (кіраўнік В. Гаявая). Інструментальны ансамбль – 9 чалавек, яго асноўная задача – суправаджэнне харэаграфічных нумароў, але ёсць і ансамблевыя самастойныя нумары.

Таксама пры абласных філармоніях існуюць ансамблі народных інструментаў. У Віцебску – адзіны ў свеце актэт балалаек «Віцебскія віртуозы», створаны ў 1973 г. заслужанай артысткай Рэспублікі Беларусь Т. А. Шафранавай. Гэта ўнікальны калектыў, дзе ёсць усе разнавіднасці балалаек: ад балалайкі пікала да балалайкі кантрабас. На ўсіх інструментах віртуозна іграюць толькі жанчыны. У яго складзе – выпускнікі Беларускай Акадэміі музыкі і Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі. Ансамбль – лаўрэат многіх міжнародных конкурсаў. Адметнай асаблівасцю калектыва з’яўляецца па-сапраўднаму аркестравае гучанне, што магчыма дасягнуць пры майстэрскі зробленых Тамарай Шафранавай інструментовак і складаных партый для ўсіх інструментаў. У Брэсце – ансамбль народных інструментаў (кіраўнік А. Гарноўскі); у Гомеле – ансамбль «Лірыца» (кіраўнік Т. Анціпаў). У Мінску – ансамбль салістаў Белдзяржфілармоніі пад кіраўніцтвам І. Іванова. Як салісты музыканты квартэта ўдзельнічалі ў розных міжнародных фестывалях і конкурсах, таму часта выступаюць з сольнымі праграмамі. У рэпертуары ансамбля творы міравой класікі, апрацоўкі народных мелодый, творы сучасных кампазітараў. У апошні час мы назіраем спробы стварэння арыгінальных ансамблей, стылізаванага характару. Яны ў сваіх саставах выкарыстоўваюць мадэрнізаваныя інструменты (за кошт электраканструкцый) і выконваюць сучасны рэпертуар.

Наша рэчаіснасць ставіць новыя задачы перад дзеячамі народна-інструментальнага выканальніцтва. Сучаснасць патра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

буе адпаведных эпосе твораў і новых форм выражэння, але безумоўна, неабходна захоўваць і далейшае развіццё лепшых традыцый. Кожны калектыў павінен захоўваць свой накірунак развіцця, свой выканальніцкі стыль, акцэнтаваць асноўную ўвагу на рэпертуар, але нават самы сучасны па складзе ансамбль народных інструментаў не павінен адрываецца ад нацыянальнай, традыцыйнай асновы. Умець пераламліваць тыя ці іншыя старыя творчыя канцэпцыі – вось поле дзейнасці цяперашніх выканаўцаў і кіраўнікоў. Гэта трэба рабіць беражліва, з пачуццем адказнасці, памятая аб тым, што ў айчынным мастацтве традыцыі і навізна – састаўныя часткі аднаго і таго ж творчага працэсу.

1. *Имханицкий, М. И.* История исполнительства на русских народных инструментах : учеб. пособие / М. И. Имханицкий. – М. : Изд-во РАМ им. Гнесиных, 2002. – 351 с.

2. *Пересада, А. И.* Оркестры и ансамбли русских народных инструментов : междунар. энцикл. / А. И. Пересада. – М. : Всероссийское музыкальное общество, 2004. – 592 с.

3. *Шибаева, Л.* Народно-инструментальное исполнительство Беларуси : вопросы теории, истории и методики : учеб. пособие / Л. Шибаева. – Минск : БелТИПК, 2004. – 152 с.

***О. А. Немцева,*** *канд. искусствоведения, преп. каф. народно-инструментального творчества БГУКИ*

## БАЯННО-АККОРДЕОННОЕ ИСПОЛНИТЕЛЬСТВО В СФЕРЕ ПОПУЛЯРНОЙ МУЗЫКИ КАК ВИД ХУДОЖЕСТВЕННО-ТВОРЧЕСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

Во второй половине XX в. исследователи все чаще обращаются к изучению различных аспектов художественной деятельности. Методология художественной деятельности как самостоятельного эстетического творчества в области искусства разработана в трудах М. Кагана [4], А. Новикова [5], Л. Столович [7]. В области музыкального искусства данной проблемы касаются М. Бонфельд [1], Е. Гуренко [3], З. Румянцева [6] и др., характеризующие композиторскую и исполнительскую художественную деятельность как наиболее творческие виды профессиональной музыкальной деятельности, направленные

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ